Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК
## Раздзел II. ТЭХНАЛОГІЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць,*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01*
*Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2017

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А. Ю. Казленка*, старшы выкладчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*вучоны* савет дзяржаўнай установы «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;
*Ю. А. Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання фондаў дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 23.05.2016 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 31.05.2016 г.);
*навукова-метадычным* саветам па бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 3 ад 23.06.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Ю. Казленка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

Вучэбная дысцыпліна «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк» складаецца з двух раздзелаў: «Тэорыя і гісторыя сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк» і «Тэхналогія сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк». Дадзеная праграма прызначана для вывучэння другога раздзела « Тэхналогія сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк».

Вучэбная дысцыпліна «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 2. Тэхналогія сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк» забяспечвае прафесійную падрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў у сферы арганізацыі сацыякультурнай прасторы бібліятэк, фарміруе веды і ўменні, неабходныя для ажыццяўлення сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк у сучасных умовах.

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны абумоўлена тым, што сёння назіраецца рост значнасці сацыякультурнай дзейнасці як грамадскай каштоўнасці; яе магчымасці і патэнцыял у дзейнасці бібліятэк спрыяюць уключэнню чалавека ў свет культуры, вырашаюць задачы фарміравання асобы ў яе развіцці і сацыяльным самавызначэнні, яны здольныя падрыхтаваць чалавека да працоўнай дзейнасці, даць умовы паўнавартаснага адпачынку, камунікацыі, самаадукацыі, насыціць неабходнай інфармацыяй, рэалізаваць творчыя патрэбы.

Вучэбная дысцыпліна структуравана па раздзелах і тэмах, якія ўяўляюць сабой адносна самастойныя ўзбуйненыя дыдактычныя адзінкі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца і спалучаецца з набытымі студэнтамі ведамі і ўменнямі пры вывучэнні вучэбных дысцыплін агульнанавуковага і агульнапрафесійнага цыкла, такіх як «Педагогіка», «Псіхалогія», «Культуралогія», «Бібліятэказнаўства» і цыкла спецыяльных дысцыплін: «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент», «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 1. Тэорыя і гісторыя сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – засваенне студэнтамі сутнасці тэхналагічнага працэсу сацыяльна-культурнай дзейнасці і авалоданне тэхналагічнымі і метадычнымі прыёмамі ажыццяўлення сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэцы.

*Задачы дысцыпліны:*

– азнаёміцца з тэрміналагічнай сістэмай вывучаемай дысцыпліны;

– засвоіць веды аб асноўных кампанентах механізма тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці, яе формах, сродках, метадах, асаблівасцях пастаноўкі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках і тэхналогіі іх рэалізацыі, асаблівасцях кіравання сацыяльна-культурнай дзейнасцю бібліятэк;

– авалодаць тэхналогіяй арганізацыі і правядзення інфармацыйна-асветніцкіх, адукацыйных, культурна-дасугавых і рэкрэацыйна-аздараўленчых мерапрыемстваў, праектнымі тэхналогіямі ажыццяўлення сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– авалодаць асновамі сцэнарнага майстэрства, рэжысуры;

– сфарміраваць уменні і навыкі арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– развіць здольнасці да пастаяннай самаадукацыі і эфектыўнай самарэалізацыі ў прафесіі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя кампаненты і этапы тэхналагічнага працэсу сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– формы, метады і выразныя сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– асновы пастаноўкі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках;

– асаблівасці арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэках;

– асновы менеджменту і маркетынгу сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэках;

– асаблівасці метадычнага забеспячэння тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэчных установах;

*умець:*

– распрацоўваць праграмы тэхналагічнага працэсу сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэках, ажыццяўляць іх аналіз, дыягностыку і рэфлексію;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– арганізоўваць масавыя, групавыя і індывідуальныя формы сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– складаць сцэнарныя планы і сцэнарыі разнастайных форм культурна-дасугавых праграм;

– выкарыстоўваць вопыт работы ўстаноў культуры ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк розных тыпаў;

*валодаць:*

– сучаснымі метадамі эфектыўнай сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк;

– драматургічнымі і рэжысёрскімі навыкамі арганізацыі культурна-дасугавых праграм у бібліятэках;

– навыкамі планавання, кантролю, уліку і справаздачнасці па выніках рэалізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэках.

У ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць эфектыўнаму засваенню ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння вучэбных і даследчых задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– рэпрадукцыйныя метады (дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў);

– метад праблемнага выкладання;

– камунікатыўныя і гульнявыя тэхналогіі;

– кантрольна-ацэначныя метады (тэсціраванне).

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 2. Тэхналогія сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк» па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент) павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-8. Устанаўліваць і падтрымліваць трывалыя сувязі з рознымі сацыяльнымі інстытутамі (сям'я, школа, установы культуры, адукацыі, прадпрыемствы і інш.) з мэтай фарміравання спрыяльнага сацыякультурнага асяроддзя; развіваць сацыяльнае партнёрства з мясцовымі ўладамі і грамадскасцю.

ПК-9. Арганізоўваць і праводзіць інфармацыйна-асветніцкія, адукацыйныя, культурна-творчыя, культурна-дасугавыя і рэкрэацыйна-аздараўленчыя мерапрыемствы.

ПК-10. Фарміраваць безбар'ернае бібліятэчнае асяроддзе для абслугоўвання асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

ПК-11. Выкарыстоўваць псіхолага-педагагічныя метады падчас бібліятэчнага абслугоўвання і правядзення разнастайных сацыяльна-культурных мерапрыемстваў.

ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

ПК-35. Праводзіць метадычны маніторынг і метадычныя даследаванні ў бібліятэках.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбна-пазнавальнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 2. Тэхналогія сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк» выкарыстоўваюцца наступныя формы: аўдыторная і групавая. Паспяховаму засваенню вучэбнай дысцыпліны спрыяе ўключэнне заданняў па дысцыпліне ў праграму вытворчай практыкі.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам і адукацыйным стандартам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк» для напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент) усяго прадугледжана 128 гадзін, з іх 68 – аўдыторныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заняткі. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 2. Тэхналогія сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк» прадугледжана 64 гадзіны, з іх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 10 гадзін, семінарскія заняткі – 4 гадзіны, практычныя заняткі – 12 гадзін, лабараторныя заняткі – 8 гадзін. Рэкамендаванай формай выніковага кантролю з'яўляецца залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінары | практычныя заняткі | лабараторныя заняткі |
| Уводзіны | 1 | 1 | | | |
| **Раздзел I. Арганізацыйна-тэхналагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк** | | | | | |
| *Тэма 1.* Характарыстыка кампанентаў, форм і сродкаў тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк | 5 | 1 | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Праектныя тэхналогіі ў сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк | 4 | 2 | | | 2 |
| **Раздзел II. Пастаноўка культурна-дасугавых праграм у бібліятэках** | | | | | |
| *Тэма 3.* Кампаненты прафесійнага майстэрства пастаноўшчыка культурна-дасугавых праграм | 4 | 2 | | 2 | |
| *Тэма 4.* Сцэнарна-рэжысёрскія асновы пастаноўкі культурна-дасугавых праграм і тэхналогія іх рэалізацыі | 6 | 2 | | 4 | |
| *Тэма 5.* Мастацкае і музычнае афармленне культурна-дасугавых праграм у бібліятэках | 4 | | | 2 | 2 |
| **Раздзел III. Кіраванне сацыяльна-культурнай дзейнасцю ў бібліятэках як частка тэхналагічнага працэсу** | | | | | |
| *Тэма 6.* Агульныя пытанні кіравання сацыяльна-культурнай дзейнасцю ў бібліятэках | 6 | 2 | | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Метадычнае забеспячэнне сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэках | 4 | | 2 | | 2 |
| **Усяго…** | **34** | **10** | **4** | **12** | **8** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 2. Тэхналогія сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк». Яе месца ў сістэме падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў студэнтаў падчас вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Тэарэтыка-практычная накіраванасць вучэбнай дысцыпліны, яе ўзаемасувязь з цыкламі агульнанавуковых, агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай працы студэнтаў. Формы кантролю. Характарыстыка забяспечанасці вучэбнай дысцыпліны вучэбнай, метадычнай і навуковай літаратурай.

## Раздзел I. Арганізацыйна-тэхналагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк

### *Тэма 1. Характарыстыка кампанентаў, форм і сродкаў тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк*

Структурна-тыпалагічная характарыстыка тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк. Кампаненты тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк. Выразныя сродкі тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Метады тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк. Формы сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк, іх месца ў структуры тэхналагічнага працэсу.

Методыка падрыхтоўкі традыцыйных, інавацыйных, вусных, наглядных і комплексных бібліятэчных мерапрыемстваў. Этапы падрыхтоўкі і правядзення бібліятэчных мерапрыемстваў: агульная характарыстыка. Інфармацыйна-асветніцкія бібліятэчныя праграмы і мерапрыемствы як сацыяльная з’ява. Сутнасць, прынцыпы і функцыі мастацка-публіцыстычнай работы бібліятэк. Задачы бібліятэчных мерапрыемстваў культурна-забаўляльнага зместу. Формы культурна-забаўляльнай дзейнасці ў бібліятэках розных тыпаў. Тэхналогія падрыхтоўкі і правядзення прэзентацый бібліятэчных прадуктаў і паслуг.

Формы, структура і жанравыя асаблівасці групавых сацыяльна-культурных праграм бібліятэк. Клубы па інтарэсах як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актуальная групавая форма сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк: патрабаванні да арганізацыі, дакументацыі, зместу дзейнасці. Гуртковая работа бібліятэк. Змест і ўмовы распрацоўкі індывідуальных форм сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэках.

Сродкі, метады і формы арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк у абслугоўванні асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

*Тэма 2. Праектныя тэхналогіі*
*ў сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк*

Мэты і задачы праектнай сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк. Функцыі праектавання ў сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк. Паняцце і характарыстыка праблемнай сітуацыі ў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Кампаненты праектных тэхналогій: вывучэнне праблемнага поля соцыуму, дыягностыка, вызначэнне мэт і задач, форм, сродкаў і метадаў. Элементы мадэлявання і канструявання бібліятэчнага асяроддзя ў сацыяльна-культурных тэхналогіях. Характарыстыка асноўных праектных тэхналагічных сістэм: рэкрэацыйнай, інфармацыйнай, асветніцкай, камунікацыйнай, відовішчнай, гульнявой, сацыяльнай – іх выкарыстанне ў бібліятэчным праектаванні.

Дыферэнцыяцыя сацыяльна-культурных праектаў па складзе ўдзельнікаў, мэтавай установцы, тэматыцы, тэрмінах рэалізацыі. Структура бібліятэчнага праекта (заяўкі). Этапы фарміравання сацыяльна-культурных праектаў у бібліятэках.

## Раздзел II. Пастаноўка культурна-дасугавых праграм у бібліятэках

*Тэма 3. Кампаненты прафесійнага майстэрства*
*пастаноўшчыка культурна-дасугавых праграм*

Шматфункцыянальнасць работы бібліятэкара падчас падрыхтоўкі культурна-дасугавых праграм. Тыпалогія вядучых у залежнасці ад асобасных якасцей вядучага і формы культурна-дасугавай праграмы. Тэхнічныя навыкі і арганізацыйныя здольнасці вядучага культурна-дасугавай праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыйная і моўная культура вядучага культурна-дасугавых праграм. Паняцці «артыкуляцыя», «дыкцыя», «інтанацыя». Артыкуляцыйная гімнастыка. Спецыфіка вядзення асобных відаў культурна-дасугавых праграм бібліятэкі. Этапы пабудовы іміджу вядучага культурна-дасугавых праграм у бібліятэках.

Падзел драматургічнай і рэжысёрскай дзейнасці бібліятэкара. Майстэрства бібліятэкара як акцёра і рэжысёра.

*Тэма 4. Сцэнарна-рэжысёрскія асновы пастаноўкі культурна-дасугавых праграм і тэхналогія іх рэалізацыі*

Драматургія – аснова мастацка-публіцыстычнай дзейнасці і сюжэтна-вобразная канцэпцыя культурна-дасугавай праграмы бібліятэкі. Сцэнарый і сцэнарны план як асноўныя віды драматургіі. Асноўныя этапы распрацоўкі сцэнарыя бібліятэчнага мерапрыемства і культурна-дасугавай праграмы. Кампазіцыя і экспазіцыя сцэнарыя.

Вызначэнне формы, праблематыкі, аўтарскай пазіцыі. Распрацоўка сэнсавага стрыжня сцэнарыя. Падбор і выкарыстанне літаратурнага і дакументнага матэрыялу. Мантаж як сродак арганізацыі сцэнарнага матэрыялу. Паняцце «рэжысёрскі сцэнарый».

Рэжысура як працэс сінтэзу сродкаў мастацка-эмацыянальнага ўздзеяння і драматургічнага матэрыялу. Этапы ўвасаблення рэжысёрскай ідэі культурна-дасугавага мерапрыемства і праграмы.

Мэты, задачы, прынцыпы і прыёмы рэжысуры пры падрыхтоўцы культурна-дасугавых праграм. Паняцце «сцэнарна-рэжысёрская эксплікацыя». Характэрныя асаблівасці сцэнарна-рэжысёрскай эксплікацыі, абумоўленыя бібліятэчнымі сродкамі. Этапы працэсу рэпетыцыі. Арганізацыйныя асновы творчага паказу праграмы. Крытэрыі ацэнкі падрыхтаванасці праграмы для правядзення ў чытацкай аўдыторыі.

*Тэма 5. Мастацкае і музычнае афармленне культурна-дасугавых праграм у бібліятэках*

Мастацкае афармленне культурна-дасугавых праграм у бібліятэках: функцыі і асноўныя патрабаванні. Сродкі сцэнічнай выразнасці. Ідэйная накіраванасць пры афармленні памяшкан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няў для правядзення культурна-дасугавых праграм у бібліятэках.

Асновы афармлення друкаванай прадукцыі да культурна-дасугавых праграм бібліятэк. Правілы падрыхтоўкі афіш. Паняцце «ай-стопер». Патрабаванні да афармлення запрашэнняў на культурна-дасугавыя праграмы бібліятэк.

Класіфікацыя музыкі ў культурна-дасугавых праграмах бібліятэк. Характарыстыка, спецыфіка і функцыі музычнага пралога, музычнага эпілога, музычнага эпізоду, нумара, антракту і музыкі падчас дзеяння. Лейтматыў у культурна-дасугавых праграмах бібліятэк.

## Раздзел III. Кіраванне сацыяльна-культурнай дзейнасцю ў бібліятэках як частка тэхналагічнага працэсу

### *Тэма 6. Агульныя пытанні кіравання сацыяльна-культурнай дзейнасцю ў бібліятэках*

Кіраўнічыя тэхналогіі ў сацыякультурнай дзейнасці: агульная характарыстыка. Адметнасці тэхналогій аналізу, прагназавання, выпрацоўкі і прыняцці кіраўнічых рашэнняў, планавання, арганізацыі выканання планаў, каардынацыі, матывацыі і кантролю ў сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк. Кіраванне матэрыяльна-тэхнічнай базай і фінансаваннем сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк. Асабісты менеджмент кіраўніка сацыякультурнай дзейнасцю бібліятэкі.

Тэхналогіі event-менеджменту і event-маркетынгу ў працэсах кіравання сацыяльна-культурнай дзейнасцю бібліятэк.

Паняцце эфектыўнасці сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк. Методыка вывучэння эфектыўнасці розных кірункаў сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк.

### *Тэма 7. Метадычнае забеспячэнне сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэках*

Сутнаснае прызначэнне метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк. Асноўныя кірункі і задачы метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк. Метадычнае забеспячэнне і метадычнае кіраўніцтва сацыяльна-культурнай дзейнасцю. Функцыі метадычнай работы ў сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці і этапы вывучэння перадавога вопыту ў тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк, асноўныя метады.

Прафесійная кампетэнтнасць бібліятэкараў-метадыстаў як фактар інтэнсіфікацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк.

Павышэнне кваліфікацыі персаналу бібліятэкі, які ажыццяўляе сацыяльна-культурную дзейнасць. Сістэма дадатковай прафесійнай адукацыі ў сферы арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк, яе спецыфічныя адметнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Асанова, И. М.* Организация культурно-досуговой деятельности : учебник / И. М. Асанова, С. О. Дерябина, В. В. Игнатьева. – 3-е изд., стер. – М. : Академия, 2013. – 192 с.
2. *Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 215 с.
3. *Головко, С. И.* Культурно-просветительская деятельность библиотеки: актуальные аспекты : моногр. / С. И. Головко. – М. : Литера, 2014. – 162 с. – (Серия «Современная библиотека»).
4. *Дзямешка, Л. А.* Бібліятэка і вольны час : вучэб. дапам. / Л. А. Дзямешка. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1995. – 75 с.
5. *Жарков, А. Д.* Технология культурно-досуговой деятельности библиотеки : учеб.-метод. пособие / А. Д. Жарков. – М. : Либерея-Бибинформ, 2008. – 239 с. – (Библиотекарь и время. XXI век ; вып. 82).
6. *Жаркова, Л. С.* Методика организации работы библиотеки в сфере социально-культурной деятельности / Л. С. Жаркова. – М., 2009. – 110 с.
7. *Кондрашкина, Е. В.* Массовое библиотечное обслуживание : учеб.-практ. пособие / Е. В. Кондрашкина. – М. : Литера, 2012. – 174 с.
8. *Ловкова, Т. Б.* Библиотека как центр досуга : учеб.-метод. пособие / Т. Б. Ловкова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2009. – 104 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век». 100 плюс 100 выпусков; вып. 102).
9. *Мурашко, О. Ю.* Социокультурное проектирование в библиотеке: теория и практика / О. Ю. Мурашко // Справочник руководителя учреждения культуры. – 2014. – № 6. – С. 28–36.
10. *Паршин, Ю. М.* Сценарные основы праздничного досуга в современной библиотеке : учеб.-метод. пособие / Ю. М. Паршин. – М. : Литера, 2011. – 206 с. – (Современная библиотека ; вып. 66).
11. *Пилко, И. С.* Технологические процессы в библиотечной работе / И. С. Пилко. – М. : Либерея-Бибинформ, 2005. – 176 с. – (Библиотекарь и время. XXI век ; вып. 26).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12.* Технология социально-культурной деятельности : учеб.-метод. пособие / Л. И. Козловская [и др.] ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2014. – 206 с.

*Дадатковая*

*13. Бирженюк, Г. М.* Основы региональной культурной политики и формирования культурно-досуговых программ / Г. М. Бирженюк, А. П. Марков. – СПб., 1992. – 126 с.

*14. Бирюкова, Т. П.* Особенности сценария культурно-досуговых программ / Т. П. Бирюкова // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2008. – № 7. – С. 35–38.

*15. Головина, Г. В.* Библиографическое обеспечение досуговой деятельности : науч.-практ. пособие / Г. В. Головина. – М. : Либерея-Бибинформ, 2008. – 128 с. – (Библиотекарь и время. XXI век ; вып. 79).

*16. Домаренко, Е. В.* Культурно-досуговая деятельность библиотеки : науч.-практ. пособие / Е. В. Домаренко. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 80 с. – (Библиотекарь и время. XXI век ; вып. 44).

*17. Ефимова, А. Н.* Формирование имиджа библиотеки как культурно-просветительного центра : учеб.-практ. пособие / А. Н. Ефимова. – М. : Литера, 2014. – 251 с.

*18. Злотникова, З. И.* Библиотека в системе социально-культурного программирования / З. И. Злотникова, И. М. Суслова // Библиотековедение. – 2002. – № 2. – С. 32–37.

*19. Капыток, А.* «У сваім краі як у раі». Бібліятэка-музей у сацыякультурнай прасторы рэгіёна: быць або не быць? / А. Капыток // Бібліятэчны свет. – 2010. – № 3. – С. 21–24.

*20.* Копилка библиотечных идей / ред.-сост. Л. В. Нестерович. – Минск : Красико-Принт, 2010. – 173 с.

*21. Мойсейчук, С. Б.* Режиссура культурно-досуговых программ : учеб. пособие / С. Б. Мойсейчук. – Минск : БГУКИ, 2011. – 99 с.

*22. Муравьева, Л. В.* Во власти странных дум…: литературный, литературно-философский, литературно-публицистический разговор как жанр библиотечной режиссуры / Л. Муравьева, Т. Рудишина // Библиотека в школе. – 2001. – № 5. – С. 12–15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*23.* Национальная библиотека Беларуси: новое здание – новая концепция развития / Нац. б-ка Беларуси ; науч. рук. Р. С. Мотульский. – Минск, 2007. – 322 с. – Глава 5. Социокультурная деятельность.

*24. Новаторов, В. Е.* Современные технологии культурно-досуговой деятельности: состояние, проблемы, перспективы развития [Электронный ресурс] / В. Е. Новаторов. – Режим доступа : http://www.omsu.omskreg. ru/vestnik/articles/y1999-i3/a109/article.html. – Дата доступа : 23.04.2011.

*25. Новикова, Г. Н.* Технологические основы социально-культурной деятельности : учеб. пособие / Г. Н. Новикова ; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – Изд. 3-е, испр. и доп. – М. : МГУКИ, 2010. – 158 с.

*26. Олзоева, Г. К.* Массовая работа библиотек : учеб.-метод. пособие / Г. К. Олзоева. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 118 с. – (Библиотекарь и время. XXI век ; 100 выпусков ; вып. 43).

*27. Переверзева, Ю. А.* Библиотека как современный социально-культурный центр: теоретические и организационные вопросы деятельности / Ю. А. Переверзева // Материалы Междунар. конгресса «Библиотека как феномен культуры», Минск, 23–24 окт. 2013 г. – Минск : Нац. б-ка Беларуси, 2013. – С. 36–41.

*28. Протопопова, Е. Н.* Библиотечная экскурсия: понятие и виды / Е. Протопопова // Библиотека. – 2008. – № 8. – С. 53–55.

*29.* Работа зарубежных библиотек с мультикультурным населением : справ. пособие / Рос. гос. б-ка, НИО библиотековедения ; сост. И. В. Чаднова. – М. : Пашков дом, 2014. – 120 с.

*30. Рукша, Г. Л.* Поиски интегральных технологий деятельности библиотек в контексте современности / Г. Л. Рукша // Библиотековедение. – 2013. – № 5. – С. 20–26.

*31. Тихоновская, Г. С.* Сценарно-режиссерские технологии создания культурно-досуговых программ : моногр. / Г. С. Тихоновская. – М. : МГУКИ, 2010. – 352 с.

*32. Тульчинский, Г. Л.* Менеджмент специальных событий в сфере культуры : учеб. пособие / Г. Л. Тульчинский, С. В. Герасимов, Т. Е. Лохина. – СПб. ; М. ; Краснодар : Планета музыки : Лань, 2010. – 381 с.

*33. Усольцева, А.* Театр в библиотеке / А. Усольцева // Библиотека. – 2003. – № 1. – С. 25–27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*34. Щирикова, Л. Д.* Социально-ориентированная проектная деятельность в библиотеке : науч.-практ. пособие / Л. Д. Щирикова, Н. В. Яценко. – М. : Литера, 2010. – 94 с.

*35. Ястраб, Ф. А.* Мастацкая галерэя ў прасторы бібліятэкі [Электронный ресурс] / Ф. А. Ястраб // Миссия библиотеки в формировании интеллектуального потенциала общества / Нац. б-ка Беларуси. – Минск : НББ, 2007. – 1 электрон. опт. диск (CD-R).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі**

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка прэзентацый;

– выкананне тэставых заданняў;

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;

– падрыхтоўка і правядзенне сацыякультурных праграм і мерапрыемстваў на базе бібліятэк і ў аўдыторыі;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах;

– залік.

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў**

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны, падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў, заліку.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па раздзелах: «Арганізацыйна-тэхналагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк», «Пастаноўка культурна-дасугавых праграм у бібліятэках», «Кіраванне сацыяльна-культурнай дзейнасцю ў бібліятэках як частка тэхналагічнага працэсу» па адной з тэм, якія прыведзены ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з’яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па дысцыпліне.

**Прыкладныя формы выканання самастойнай работы:**

– напісанне рэферата (не менш 12 старонак);

– распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);

– распрацоўка аўдыявізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– распрацоўка метадычных матэрыялаў па выкананні пэўных кірункаў сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк (не менш 12 старонак).

## Прыкладныя тэмы для самастойнай работы

### *Раздзел I. Арганізацыйна-тэхналагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк*

1. Кампаненты тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк.
2. Сродкі, формы і метады сацыяльна-культурнай дзейнасці як асноўныя складаючыя тэхналагічнага працэсу.
3. Выразныя сродкі тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці.
4. Этапы падрыхтоўкі і правядзення бібліятэчных мерапрыемстваў.
5. Інфармацыйна-асветніцкія бібліятэчныя праграмы і мерапрыемствы як сацыяльная з'ява.
6. Сутнасць, прынцыпы і функцыі мастацка-публіцыстычнай работы бібліятэк.
7. Мэты і прынцыпы рэалізацыі культурна-забаўляльных мерапрыемстваў у бібліятэках.
8. Мэты, задачы і асноўныя кірункі групавой і індывідуальнай работы з карыстальнікамі.
9. Клубы па інтарэсах як актуальная групавая форма сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк.
10. Гуртковая работа бібліятэк.
11. Змест і ўмовы распрацоўкі індывідуальных форм сацыяльна-культурнай дзейнасці ў бібліятэках.
12. Этапы фарміравання сацыяльна-культурных праектаў у бібліятэках.

### *Раздзел II. Пастаноўка культурна-дасугавых праграм у бібліятэках*

13. Шматфункцыянальнасць работы бібліятэкара падчас падрыхтоўкі культурна-дасугавых праграм.
14. Спецыфіка вядзення асобных відаў культурна-дасугавых праграм бібліятэкі.
15. Этапы пабудовы іміджу вядучага культурна-дасугавых праграм у бібліятэках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. Майстэрства бібліятэкара як акцёра і рэжысёра.

17. Сцэнарый і сцэнарны план як асноўныя віды драматургіі.

18. Рэжысура як працэс сінтэзу сродкаў мастацка-эмацыянальнага ўздзеяння і драматургічнага матэрыялу.

19. Арганізацыйныя асновы творчага паказу культурна-дасугавай праграмы.

20. Мастацкае і музычнае афармленне культурна-дасугавых праграм у бібліятэках.

*Раздзел III. Кіраванне сацыяльна-культурнай дзейнасцю ў бібліятэках як частка тэхналагічнага працэсу*

21. Кіраўнічыя тэхналогіі ў сацыякультурнай дзейнасці: агульная характарыстыка.

22. Асабісты менеджмент кіраўніка сацыякультурнай дзейнасцю бібліятэкі.

23. Тэхналогіі event-менеджменту і event-маркетынгу ў працэсах кіравання сацыяльна-культурнай дзейнасцю бібліятэк.

24. Паняцце і методыка вывучэння эфектыўнасці сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк.

25. Асноўныя кірункі і задачы метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк.

26. Асаблівасці і этапы вывучэння перадавога вопыту ў тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк, асноўныя метады.

27. Прафесійная кампетэнтнасць бібліятэкараў-метадыстаў як фактар інтэнсіфікацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК**
**Раздзел ІІ. ТЭХНАЛОГІЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК**

*Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць,*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01*
*Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,22. Ул.-выд. арк. 1,99. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ